АБМЯРКОЎВАЕМ АРТЫКУЛ Б. А. МЕЛЬЦЭРА „ХАТА ПРЫГОЖАЯ і ВУГЛАМІ“

# АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Увесь той час, колькі ведаю я наш універсітэт (а ведаю я яго з 1922 года), адной з важнейшых яго традыцый быў і застаецца актыўны ўдзел студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага складу ў практычным ажыццяўленні надзённых палітычных, культурных і гаспадарчых задач, што стаяць перад рэспублікай.

У першыя гады існавання універсітэта большасць студэнтаў і многія супрацоўнікі былі актыўнымі ліквідатарамі непісьменнасці, у трыццатых гадах — прапагандыстамі і арганізатарамі калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У гады Вялікай Айчыннай вайны большая частка студэнтаў і выкладчыкаў улілася ў рады абаронцаў Радзімы, якія адстойвалі са зброяй у руках яе свабоду і незалежнасць на франтах і ў тыле ворага — у партызанскіх атрадах. Другая частка самааддана кавала перамогу ў савецкім тыле. У першыя пасляваенныя гады ўвесь вольны ад вучэбных і навуковых заняткаў час аддаваўся працы па аднаўленню не толькі разбураных універсітэцкіх карпусоў, кабінетаў і лабараторый, але і сталіцы нашай рэспублікі. Працоўная дапамога калгасам і саўгасам ва ўборцы ўраджаю, удзел у асваенні цалінных зямель — усё гэта толькі важнейшыя звенні адной з лепшых традыцый нашага універсітэта.

А ці шмат ведаюць студэнты і навуковыя супрацоўнікі малодшага пакалення пра бесперапыннасць гэтай традыцыі, пра лепшых яе носьбітаў на кожным этапе развіцця і росту універсітэта. Добра напісаная і не менш добра па-выдавецку аформленая і ілюстраваная гісторыя універсітэта і яго факультэтаў безумоўна неабходная. І як мага хутчэй. Мне вядома, што некаторыя таварышы працавалі над гэтым, але задача так і засталася яшчэ не выкананай да канца.

У гэтым жа плане стаіць і пытанне аб музеі гісторыі універсітэта. Укараняць і памнажаць традыцыі можна толькі на канкрэтных фактах, лічбах, партрэтах, фатаграфіях, а не толькі на агульных фармуліроўках і абстрактных схемах.

Бесперапынна ўзрастаючы уклад нашага універсітэта у развіццё навук і ў справу падрыхтоўкі навуковых кадраў рэспублікі — таксама важнейшая традыцыя нашага універсітэта. Але пра яе большасці студэнтаў, а тым больш не студэнтам і не работнікам універсітэта, вядома яшчэ менш, чым пра папярэднюю.

Чаму б нам не аднавіць існаваўшую некалі практыку, што, выходзячы на святочную дэманстрацыю, студэнты неслі макеты самых каштоўных з ліку напісаных работнікамі універсітэта ў бягучым годзе манаграфій, падручнікаў, дысертацый, транспаранты з найбольш характэрнымі паказчыкамі дасягненняў у галіне вучэбнай і навуковай работы, фатаграфіі або партрэты перадавікоў?

Дарэчы, пра фатаграфіі. На нашым хімічным факультэце неаднаразова былі выпадкі, калі некаторыя фатаграфіі з адкрытых фотавітрын зрываліся. І вось зеўрае такая вітрына пустотамі, якія невядома як расцэньваць: ці то вынік хуліганскага спосабу атрымаць партрэт таго або той, ці то выказванне нязгоды з думкай факультэцкага калектыву, які рашыў адзначыць вартасці таварыша.

А ці шмат працы і клопатаў неабходна, каб такія вітрыны былі па-мастацку аформленымі, зашклёнымі, забяспечанымі адпаведнымі заклікамі-лозунгамі, а не ўяўлялі сабою зручную плошчу для акумулявання пылу і аб'ект для аматараў калекцыяніраваць чужыя фотакарткі?

Прызнаюся, мяне не вельмі пераконваюць довады аб перавазе назвы «матрыкул» перад «залікоавй кніжкай». Але ў тым, што датычыцца да знешняга выгляду гэтага дакумента, я цалкам падтрымліваю думку Б. А. Мельцэра аб неабходнасці рэзкага паляпшэння яго эстэтычных і, так сказаць, «эксплуатацыйных» вартасцей. Аднак я не хацеў бы абмежавацца толькі гэтым. Чаму б у гэты дакумент не заносіць звесткі аб выніках грамадскай дзейнасці студэнта, яго дакладах на навуковых канферэнцыях, дасягненнях у галіне мастацкай самадзейнасці, спорту, атрыманых заахвочваннях, узнагародах і г. д.?

Пры размеркаванні ж скончыўшых павінны брацца на ўвагу ўсе бакі вучобы і грамадскай дзейнасці студэнта за гады яго знаходжання ва універсітэце. Вось і была б у наяўнасці самая грунтоўная і самая аб'ектыўная характарыстыка. А то, уявіце сабе, у якое становішча трапляе сакратар камсамольскай арганізацыі курса, які павінен характарызаваць сваіх таварышаў-выпускнікоў, калі ён сам вучыцца ва універсітэце першы ці другі год.

Загаварыўшы пра выпускнікоў, я хацеў бы выказаць пажаданне, каб пры рашэнні пытання аб рэкамендацыі ў аспірантуру ці аб пакіданні пры кафедры, а таксама пры вылучэнні кандыдатур на атрыманне імянных стыпендый больш шырока, чым гэта цяпер практыкуецца, выяўлялася і ўлічвалася думка курса, групы, у якой вучыцца студэнт.

А. БАРКАН,
дацэнт хімічнага факультэта.

# У наш час... без радыё!

Субота. Універсітэцкі інтэрнат па вуліцы Свярдлова. Ціха. Нават радыё не чуваць. Мо' усе пайшлі куды-небудзь?

— Ау!

У калідор высунулася галава.

— Вам патрэбны Саша Фларызяк, — канстатуе студэнт, пачуўшы слова «радыё». — Ён пайшоў на вечар.

«Радыёначальства», значыць, няма. Што ж, пакуль пагутарым са студэнтамі.

Трэцякурснік аддзялення беларускай мовы і літаратуры Рыгор Галавачэнка на некалькі хвілін адклаў у бок курсавую работу.

— Што можна сказаць пра работу нашага радыёвузла? — перапытвае Рыгор. — А тое, што апошнюю перадачу мы чулі недзе каля 8 сакавіка. Раней, калі тут жылі толькі філфакаўцы, перадач было куды болей.

ПадніМаюся паверхам вышэй. Ленпакой. Тут ужо, пэўна, калі не тэлевізар, дык радыёкропка павінна быць. На жаль, ні таго, ні другога. Прыйдзецца пабываць яшчэ раз у інтэрнаце. Відавочна, субота не падыходзячы дзень для размовы пра радыё.

Панядзелак. Гэты ж інтэрнат. Саша Фларызяк на месцы. Збіраецца з сябрамі адзначаць дзень нараджэння свайго аднакурсніка.

— Прыходзьце лепш заўтра ў 10 гадзін. Будзе весціся запіс святочнай перадачы. Паслухаеце, пагаворым.

Фларызяк яўна ухіляецца ад размовы, і я вымушана згадзіцца.

Аўторак. Прыйшла раней, чым дамовіліся. Саша гуляе ў валейбол. Зразумела, яму не да размовы пра радыё... Што ж, пачакаю.

Зайшла ў 73-і пакой. Оля Шапялевіч і Люда Шкеціна — пяцікурсніцы, Зоя Міронава — на чацвёртым курсе хімфака. Тут яны жывуць з пачатку другога семестра, пасля «вялікага перасялення» з інтэрната па Паркавай.

— Нічога добрага мы не можам сказаць пра работу радыёвузла, — кажа Оля, а Люда дадае:

— Як пачуеш добрую песню, так ведаеш, што вось-вось яе абарвуць якой-небудзь прозай, накшталт: «Таварышы студэнты, філолагі і хімікі, сёння будзе абменьвацца пасцельная бялізна».

— Сваіх перадач вельмі мала,— падтрымлівае сяброўка Зоя.

Не бывае канцэртаў па заяўках студэнтаў. Не трансліруюцца канцэрты студэнцкай мастацкай самадзейнасці. А хімікі ж маюць нядрэнны творчы калектыў. Дарэчы, тут жыве баяніст Валодзя Сонін. Пра гэта ведаюць радыёкамітэтчыкі, але цудоўную магчымасць не выкарыстоўваюць.

Радыёвузел. Саша Фларызяк і Рэня Лукашэвіч корпаюцца з магнітафонам.

— Гук дрэнны. Пэўна, лямпа «села», — растлумачвае Саша.

Разумею: так і не прыйдзецца мне пачуць вясеннюю перадачу.

У інтэрнаце фактычна няма радыёкамітэта. Але ёсць адказны за культмасавую работу К. Пятакоў. Арганізацыя перадач па чарзе даручаецца камсоргам груп: задача мясцовага радыё — адлюстроўваць студэнцкае жыццё, праводзіць выхаваўчую работу. Усё гэта толькі прыгожыя словы.

Раней, калі ў інтэрнаце жылі адны філолагі, былі цікавыя перадачы, якія з нецярплівасцю чакалі студэнты. Гэта прызнае і Фларызяк. Цяпер жа за паўгода ніяк не могуць наладзіць сапраўдную сувязь, кантакт паміж двума факультэтамі.

— Дарэчы, у нас няма патрэбнага абсталявання. Вось, — дае ён мне лісток паперы, — бегаў у прафком, абіў усе парогі — далі дзесяць рублёў. Купіў лямпы для ўзмацняльніка. Магнітафон сапсаваўся — надакучыў усім у камітэце камсамола. Дапамаглі выклікаць інжынера. Той адрамантаваў магнітафон, але не доўга мы радаваліся.

Чытаю заяўку на 12 дэталяў, адрасаваную прарэктару па адміністрацыйна - гаспадарчай часткі тав. А. В. Кірсанаву, якую падпісалі старшыня прафбюро Ковель, старшыня студсавета Харужы, адказны ад парткома Пятакоў.

— Абяцалі ўсё, акрамя прайгравальніка, грамафонных пласцінак і магнітафоннай ленты, — горка каментыруе Саша. — А гэта ж асноўнае, без гэтага нельга зрабіць радыёгазету. Былі б пласцінкі — выкруціліся б як-небудзь.

«Выкруціліся б». Здзіўляе і абурае раўнадушша тых, хто па свайму партыйнаму і службоваму абавязку павінен пастаянна клапаціцца аб ідэйным выхаванні моладзі і хто павінен пастаянна памятаць, што радыё — гэта газета без паперы і што асноўнае прызначэнне радыё — выхоўваць студэнтаў, будучых спецыялістаў народнай гаспадаркі.

Тамара КАРОЛЬ.



Харошае гэта слова — студэнт! У імневерагоднае спалучэнне сур'ёзнасці і весялосці, сілы і мяккасці, строгасці і свабоды. Паспрабуйце, не гледзячы ў слоўнік, вызначыць сэнс гэтага слова. І што ні адказ, то новае вызначэнне вы пачуеце. У студэнцкія гады хутка пачынаецца дружба: яшчэ ўчора нічога не ведалі адзін пра аднаго, а сёння ўжо здаецца, што ўсё жыццё прайшлі побач. Паглядзіце на гэтую групу студэнтаў, якую сфатаграфаваў наш фотакарэспандэнт, студэнт 1 курса аддзялення журналістыкі Міхась Красуцкі. Цяжка паверыць, што зусім нядаўна студэнт 4 курса біялагічнага факультэта Анатоль БАЛЕСНЫ, кубінская студэнтка Нельса ЧАНГ і яе калега з падрыхтоўчага факультэта кеніец Поль КІМАНІ былі зусім незнаёмыя. А цяпер яны пры сустрэчы вітаюць адзін аднаго сардэчным словам «Добры дзень!».

# „Будзем хадзіць!“

Група турыстаў матэматычнага, фізічнага, хімічнага, біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў пабывала ў трохдзённым паходзе, прысвечаным 1 Мая. Асноўная маса студэнтаў упершыню выходзіла ў турыстычны паход, але вопыт кіраўнікоў секцыі Барыса Яшчына, Дзімы Галяшэвіча і Сашы Кулібабы дапамог. Паход прайшоў цікава і весела. Усе 18 юнакоў і 45 дзяўчат могуць пацвердзіць гэта. Ва ўсякім разе, удзельнікі паходу ў адзін голас сцвярджаюць: «Будзем яшчэ хадзіць!».

Калі вы захочаце больш падрабязна даведацца пра гэты паход, пазнаёмцеся са стэндам-справаздачай з жартоўнай назвай «Не лятайце самалётам, хадзіце пяшком», што вывешаны на чацвёртым паверсе галоўнага корпуса універсітэта.

# РУАНДА змагаецца

Я вельмі рады, што маю магчымасць пазнаёміць чытачоў газеты «Беларускі універсітэт» з маёй радзімай — Руандай.

Руанда — гэта прыгожая афрыканская краіна. Яна размешчана прыкладна ў цэнтры Афрыкі і мае межы з 4 краінамі: Конга, Танганьікай, Бурундзі, Угандай. Першымі каланізатарамі Руанды былі немцы, потым яна была перададзена пад апеку Бельгіі.

Бельгійцы стараліся насадзіць у Руандзе сваю рэлігію. Вось чаму першыя пісьменныя людзі Руанды былі святарамі... 

Бельгійцы стараліся насадзіць у Руандзе сваю рэлігію. Вось чаму першыя пісьменныя людзі Руанды былі свяшчэннікамі. Няверуючыя ж не атрымоўвалі ніякай адукацыі. Так прайшлі многія гады. Народ Руанды рашыў стварыць свой нацыянальны Савет, які павінен быў займацца нацыянальнымі пытаннямі пры бельгійскім каланіяльным урадзе ў Руандзе.

Ідэі сацыялізма, якія абыйшлі ўвесь свет, дайшлі і да нашага народа, хоць бельгійцы супраціўляліся іх пранікненню. У 1954 годзе была створана нацыянальная партыя УАР. Бельгійцы адразу ж абрушылі хвалі рэпрэсій супраць членаў Цэнтральнага Камітэта гэтай партыі. Народ хацеў будаваць новае жыццё, і партыя ад яго імя патрабавала незалежнасці. Але гэта слова прывяло ў шаленства каланізатараў, і ўсе члены партыі былі арыштаваны. Аднак новыя ідэі працягвалі знаходзіць падтрымку ў народзе, і рух за нацыянальнае вызваленне ўсё пашыраўся.

У 1960 годзе бельгійскі ўрад накіраваў у Руанду дзесяць тысяч салдат, якія павінны былі падавіць нацыянальны вызваленчы рух. У пачатку 1961 года многія барацьбіты за нацыянальнае вызваленне былі знішчаны. І толькі некаторым з іх удалося выехаць за межы краіны і працягваць сваю дзейнасць.

Пасля смерці нашага брата, нацыянальнага героя Конга Патрыса Лумумбы бельгійцы пры падтрымцы амерыканцаў, якіх мы называем «бацькамі каланіялізму і імперыялізму», стварылі сваю базу ў Руандзе для барацьбы супраць нашых братніх краін.

Дарагія таварышы! Вельмі цяжка ў некалькіх словах расказаць усё пра маю краіну, якая хоць і малая па плошчы, але мае вялікую гісторыю. Народ Руанды змагаецца супраць каланіялізму і імперыялізму. Ён хоча міру паміж народамі. Ён марыць аб тым часе, калі Афрыка поўнасцю вызваліцца ад прыгнёту каланіялізму.

Альфонс БУТЭЛА,
руандзец, студэнт падрыхтоўчага факультэта БДУ.

# О теме

Читал стихи шахтер в забое,
Когда устали молотки.
И удивлялись: «Ну, и кроет!»
Его чумазые дружки.

Но, вытирая капли пота,
Присев устало на распил,
Сказал один: «Чиста работа,
Ты это верно, брат, схватил.

Я стихотворных этих правил
Совсем, признаться, не знаток.
И помолчав чуть-чуть, добавил:
«Но что-то всё-таки не то.

Ты это здорово про зори,
Когда над речкою вдвоём.
Тебе видней, не буду спорить,
Но лучше б, если б о другом.

Тут не поймёшь, конечно, сразу,
Вопрос, товарищ, не простой,..»
И встал, высокий и чумазый,
Шагнул решительно в забой.

И снова грохот транспортёров
И стук тяжёлых молотков
Как продолженье разговоров
О важной теме для стихов.

С. БОРОДОВСКИЙ.

В. а. рэдактара В. І. ДУБОВІК.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02243. Тыр. 2000. Зак. 2091.